ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)В, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 14 (7091) | Аўторак, 15 лютага 1944 г. | Цана 20 кап.

**Наступленне Чырвонай Арміі прадаўжаецца. Войскі Ленінградскага фронта атрымалі новыя бліскучыя перамогі. У выніку ўмелага абходнага манёўра і паследуючага затым штурма, авалодалі горадам Луга—важным вузлом камунікацый і моцным апорным пунктам абароны немцаў.**

**Слава доблеснай Чырвонай Арміі!**

## ЗАГАД
## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

### Генералу арміі ГОВАРАВУ

Войскі Ленінградскага фронта, развіваючы наступленне, у выніку ўмелага абходнага манёўра і паследуючага затым штурма, учора, 12 лютага, авалодалі горадам Луга—важным вузлом камунікацый і моцным апорным пунктам абароны немцаў.

У баях за авалоданне горадам Луга вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта Свірыдава, генерал-маёра Трубачова, генерал-маёра Хазава, генерал-маёра Казачок, генерал-маёра Іванова, генерал-маёра Якутовіча, генерал-маёра Ястрабава, генерал-маёра Бунькова, палкоўніка Батлука, палкоўніка Елцынава, палкоўніка Баршчова, артылерысты генерал-маёра артылерыі Каробчэнка, падпалкоўніка Горскага, падпалкоўніка Ляшчэнка, маёра Вышкова, маёра Гарадзецкага, лётчыкі генерал-лейтэнанта авіяцыі Рыбальчэнка, генерал-маёра авіяцыі Андрэева і сапёры маёра Кульвінскага і маёра Ерастова.

У азнаменаванне атрыманай перамогі найбольш вызначыўшыеся ў баях злучэнні і часці прадставіць да прысваення найменавання „Лужскіх" і да ўзнагароды ордэнамі.

Сёння, 13 лютага, у 20 гадзін сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе нашым доблесным войскам, авалодаўшым горадам Луга,—дванаццацю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях за вызваленне горада Луга.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захватчыкам!

*Вярхоўны Галоўнакамандуючы*

*Маршал Савецкага Саюза*

*І. СТАЛІН.*

13 лютага 1944 года.

## Ад Савецкага Інформбюро

### З аператыўнай зводкі за 13 лютага

Войскі Ленінградскага фронта, развіваючы наступленне, у выніку ўмелага абходнага манёўра і паследуючага затым штурма, учора, 12 лютага, авалодалі горадам і чыгуначным вузлом Луга.

Войскі гэтага-ж фронта, наступаючыя ўздоўж узбярэжжа Чудскога возера і на ўсход ад яго, за 5 дзён наступальных баёў авалодалі раённымі цэнтрамі Ленінградскай області горадам Гдоў, Полна, Ляды, а таксама занялі больш 800 другіх насялёных пунктаў, у тым ліку буйныя насялёныя пункты Мелгаўшчына, Багданаўшчына, Лаптавіцы, Ветвеннік, Братухнова, Астраўцы, Чэрнева, Заянне, Сербіна, Малое Заполле, Зарудзінне, Должыцы, Усадзішчэ і чыгуначныя станцыі Юшкінская, Замагілле, Язбы. Нашымі войскамі поўнасцю ачышчана ад праціўніка ўсходняе ўзбярэжжа возера Чудское.

На поўнач ад Звенігародка і Шпола нашы войскі прадаўжалі весці баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка і авалодалі насялёнымі пунктамі Сітнікі, Сотнікі, Арбузіна і чыгуначнай станцыяй Сотнікі. Адначасова на паўночны-захад ад Звенігародка нашы войскі адбівалі контратакі буйных сіл танкаў і пяхоты праціўніка, якія імкнуліся прабіцца на дапамогу да акружанай групіроўкі і нанеслі яму вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

### З аператыўнай зводкі за 14 лютага

На працягу 14 лютага на поўдзень і на паўднёвы-ўсход ад горада Гдоў нашы войскі прадаўжалі наступленне і занялі некалькі насялёных пунктаў.

На поўдзень ад горада Луга нашы войскі вялі наступальныя баі, у ходзе якіх авалодалі насялёнымі пунктамі Баранава, Заполле, Смердзі, Пустошка, Дуброўка, Кут, Раковічы, Навалак.

На поўнач ад Звенігародка і Шпола нашы войскі прадаўжалі весці баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка і, зламаўшы яго супраціўленне, авалодалі раённым цэнтрам Кіеўскай області горадам Карсунь-Шэўчэнкаўскі і насялёнымі пунктамі Кашмат, Ліствена, Петрушкі, Туркенцы, Самародня. Адначасова на паўночны-захад ад Звенігародка нашы войскі вялі жорсткія баі з буйнымі сіламі танкаў і пяхоты праціўніка, якія імкнуліся прабіцца на дапамогу да акружанай групіроўкі. Цаной вялікіх страт у жывой сіле і тэхніцы праціўніку ўдалося нязначна ўклініцца ў нашу абарону.

На другіх участках фронта—разведка, артылерыйска-мінамётная перастрэлка і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

На працягу 13 лютага нашы войскі на ўсіх фронтах падбілі і знішчылі 95 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі знішчана 58 самалётаў праціўніка.



НА ЗДЫМКУ: Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР тав. І. В. Сталін, Прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі пан Ф. Д. Рузвельт, Прэм'ер Міністр Вялікабрытаніі пан У. Чэрчыль. (Знята ў Тэгеране ў часе Канферэнцыі кіраўнікоў трох саюзных Дзяржаў).

## Сем'ям франтавікоў— большэвіцкія клопаты

Наша партыя і ўрад праяўляюць выключныя клопаты аб сем'ях абаронцаў Радзімы. На гэтыя мэты дзяржава затрачвае вялікія сродкі. Яна дапамагае сем'ям франтавікоў адзеннем, прадавольствам, клапоціцца аб устройстве іх працы і быта.

Ажыццяўляючы на практыцы гэта важнае дзяржаўнае мерапрыемства, па нашай області на 10 лютага бягучага года 1800 сем'ям ваеннаслужачых і партызан выплачана з дзяржаўных сродкаў на пенсіі і дапамогу каля 246 тысяч рублёў.

Асабліва вялікую работу ў гэтых адносінах правялі ў Лёзненскім раёне. Загадчык аддзелам Дзяржзабяспечання тав. Кожунаў з першых-жа дзён вызвалення раёна ад нямецкіх захватчыкаў крапатліва ўзяўся за арганізацыю сваёй работы. З лістапада месяца мінулага года сума выплачаных сродкаў на пенсіі і дапамогу па раёну дасягае 123 тысяч рублёў, якія атрымалі 165 сем'яў ваеннаслужачых і партызан. Апрача таго, аддзел дзяржзабяспечання выдаў сем'ям франтавікоў звыш 500 кілограмаў хлеба, многа бульбы. 29 сем'яў ваеннаслужачых і партызан атрымалі ўтульныя цёплыя жыллёвыя памяшканні, 67 сем'яў забяспечаны адзеннем, 36 чалавек устроены на работу. Выяўлена і ўстроена ў дзіцячы дом звыш 260 беспрытульных дзяцей, якія засталіся без бацькоў.

Па Суражскаму раёну (заг. аддзелам Дзяржзабяспечання тав. Шпакоўская) узяты на ўчот усе сем'і ваеннаслужачых і партызан. 522 сем'ям ужо аказана дапамога на агульную суму 110418 рублёў. 34 чалавекі ўстроены на работу і 48 сем'яў, пазбаўленыя нямецкімі катамі жылля, зараз забяспечаны жыллёвымі памяшканнямі. Усе дзеці-сіроты ўстроены ў дзіцячыя ўстановы і за імі забяспечан належны догляд.

465 сем'яў франтавікоў атрымалі 16903 кілограмы хлеба, 158560 кілограмаў фуража, некалькі сям'яў атрымалі каровы.

Гераічная Чырвоная Армія бязлітасна знішчае нямецкіх захватчыкаў, гоніць іх з нашай роднай зямлі, а нашы слаўныя партызаны і партызанкі наносяць адчувальныя ўдары ворагу з тыла. Клопаты аб сем'ях франтавікоў і партызан, уважлівыя адносіны да іх патрэб—справа вялікай дзяржаўнай важнасці.

С. Ф. МАЦЮХІН.

Нам. заг. Абласнога аддзела Дзяржзабяспечання.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# Комуністы на аднаўленні МТС

Вызваленая тэрыторыя Расонскага раёна аказалася спустошанай і разбуранай немцамі. Перад працоўнымі паўстала задача—поўнасцю аднавіць разбураную гаспадарку раёна. Узначаліць гэту вялікую работу ўзяліся комуністы і комсамольцы.

Па рашэнню Райкома партыі на аднаўленне Чырвонаармейскай МТС былі пасланы комуністы, з якіх была створана пярвічная партыйная арганізацыя.

Партарганізацыя адразу-ж узялася за стварэнне рамонтных трактарных брыгад. На чале іх былі пастаўлены комуністы і лепшыя правераныя беспартыйныя таварышы. Зараз рамонт і падрыхтоўка трактароў праводзіцца не толькі для нашай, але і для астатніх МТС нашага раёна.

Мне было даручана ў першую чаргу арганізаваць кузнечную майстэрню. На працягу некалькіх дзён быў знойдзен кузнечны інструмент, падобран будынак. Кузнечная майстэрня пачала працаваць.

Комуніст таварыш Ткачэнка прыстасаваў пад рамонтную трактарную майстэрню адпаведнае памяшканне. Пасля гэтага рамонтныя брыгады пачалі звозіць сюды трактары, якія ў час нямецкай акупацыі работнікамі МТС былі вывезены ў лес і там разабраны, а часці схаваны.

У зборы трактарных часцей і падвозцы іх да месца рамонта ўдзельнічалі ўсе комуністы, у тым ліку і кіраўнікі МТС. Сваім асабістым прыкладам яны вялі за сабой беспартыйных таварышоў на хутчэйшы збор і рамонт трактароў.

У самы кароткі тэрмін пры асабістым удзеле дырэктара Расонскай МТС комуніста тав. Ткачэнка, механіка МТС члена партыі Іванова, кандыдата партыі тав. Зуева, сакратара комсамольскай арганізацыі тав. Вавілонскага рамонтнымі брыгадамі было прывезена да майстэрні 35 трактароў маркі ХТЗ.

У рамонтнай майстэрні закіпела работа. Брыгады ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва. Стала выходзіць насценная газета, якая адлюстроўвае ход рамонту трактароў і паказвае перадавікоў соцыялістычнага спаборніцтва.

Уперадзе ўсіх па рамонту ішла брыгада комуніста тав. Шчэдрова. Але справа стала з-за недастаўкі трактарных мастоў, якія знаходзіліся далёка ў лесе. Нехапала цяглавай сілы.

Дзве брыгады, кіруемыя беспартыйнымі таварышамі Прохаравым і Бураковым, сталі апераджаць брыгаду комуніста. Гэта ўсхвалявала тав. Шчэдрова і ён звярнуўся да парторга. У той-жа дзень Шчэдрову была аказана дапамога і ў выніку — рамонт быў закончан своечасова.

Рыхтуючы да веснавой сяўбы трактары, перад партарганізацыяй паўстала пытанне аб неабходнасці стварэння нафтабазы, якую знішчылі немцы. Усе цыстэрны былі пабіты і прыведзены ў нягоднасць. Аднавіць нафтабазу партарганізацыя даручыла мне. Разам з сакратаром комсамольскай арганізацыі тав. Вавілонскім мы падабралі брыгаду слесараў і на працягу трох дзён нафтабаза была адноўлена.

Паўстала пытанне аб падрыхтоўцы кадраў для МТС. Райком партыі даручыў комуністу таварышу Лазарэнка арганізаваць курсы трактарыстаў. Падабраўшы будынак, падручнікі, выкладчыкаў, 2-га студзеня тав. Лазарэнка адкрыў курсы трактарыстаў, на якіх навучаецца 70 чалавек, з іх 63 дзяўчыны.

Не гледзячы на тое, што ўся партарганізацыя вельмі многа працуе на аднаўленні МТС, усе комуністы вывучаюць кнігу таварыша Сталіна „Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза“. Кніга таварыша Сталіна яшчэ больш натхняе нас на барацьбу па аднаўленню жыцця на вызваленай зямлі.

Г. СІДЗЕЛЬНІКАЎ,
дырэктар Чырвонаармейскай МТС.

## ВЫВУЧАЮЦЬ КНІГУ ТАВАРЫША СТАЛІНА

Ва ўсіх вызваленых раёнах нашай вобласці шырока разгарнулася вывучэнне кнігі таварыша Сталіна „Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза“. Пры райкомах партыі і пярвічных партыйных арганізацыях працуюць 44 гурткі, у якіх займаецца каля 600 комуністаў. Больш 50 чалавек вывучаюць кнігу таварыша Сталіна самастойна. Многа комуністаў ужо закончылі вывучэнне кнігі правадыра.

Добра пастаўлена гэта работа ў Суражскім, Дубровенскім і ў Лёзненскім раёнах.

Глыбока вывучаюць кнігу правадыра калгаснікі і інтэлігенцыя. Больш 900 чалавек калгаснікаў і сельскай інтэлігенцыі займаюцца ў гуртках, створаных пры сельсоветах і ў асобных калгасах.

Вялікую работу ў гэтай галіне прарабілі райкомы комсамола. Яны арганізавалі 52 гурткі, у якіх займаецца каля 800 комсамольцаў і несаюзнай моладзі. Многія комсамольцы займаюцца самастойна.

ЕФІМ Л.

## *Узорна падрыхтуемся да веснавой сяўбы*



Калгас „Саюз будаўнікоў“ (Новасібірская вобласць) дзейна рыхтуецца да вясны, праводзячы снегазатрыманне на ўсёй плошчы азімых пасеваў.

На здымку: расстаноўка шчытоў для снегазатрымання.

### Лішкі хлеба—дзяржаве

Дзяржаўныя закупкі хлебных лішкаў у калгасаў і калгаснікаў,—важнае гаспадарчае і палітычнае мерапрыемства. Паспяховае правядзенне іх дае дадатковыя сотні і тысячы тон хлеба ў фонд дзяржавы.

Многія кіраўнікі гандлёва-загатавіцельных арганізацый раёнаў нашай вобласці па сапраўднаму зразумелі важнасць гэтага мерапрыемства і ўзорна арганізавалі дзяржаўныя закупкі. Па даных Облспажыўсаюза на 5 лютага гэтага года агульная колькасць зярна, закупленага ў калгасаў і калгаснікаў, складае 53,4 тоны і каля 160 тон бульбы.

Пяршынства ў правядзенні закупак займае Расонскі раён. Спажыўсаюзам гэтага раёна ўжо закуплена ў дзяржаўны фонд 370 цэнтнераў зярна і каля 3,5 тон бульбы. Каля 460 цэнтнераў бульбы і значную колькасць зярна закупіў Лёзненскі райспажыўсаюз. Звыш 298 цэнтнераў зярна і бульбы закуплена Сіроцінскім райспажыўсаюзам.

Аднак, ёсць і такія раёны, у якіх кіраўнікі гандлёва-загатавіцельных арганізацый не арганізавалі дзяржаўных закупак лішкаў хлеба і бульбы ў калгасаў і калгаснікаў. Не мабілізавалі на гэту справу грамадскасці.

Старшыня Гарадоцкага райспажыўсаюза т. Кусціц не арганізаваў дзяржзакупак. Тут закупілі ўсяго толькі 100 цэнтнераў бульбы і на гэтым супакоіліся.

Зусім недастаткова займаюцца пытаннем дзяржзакупак кіраўнікі гандлёва-загатавіцельных арганізацый Мехаўскага і Суражскага раёнаў.

Вызваленыя ад нямецка-фашысцкай кабалы калгаснікі зараз гараць жаданнем дапамагчы роднай дзяржаве сваім удзелам у стварэнні дадатковых крыніц хлеба і ўсе лішкі свае прададуць у дзяржаўны фонд.

М. АЛЕКСАНДРАЎ.

### Працоўны энтузіязм калгаснікаў

У канцы мінулага года доблесная Чырвоная Армія разбіла і выгнала з межаў нашага раёна ненавісных нямецка-фашысцкіх захватчыкаў, якія на працягу двух з паловай год рабавалі і знішчалі ні ў чым непавіннае насельніцтва, рабавалі і разбуралі нашы калгасы.

Зараз вернутыя Чырвонай Арміяй да жыцця калгаснікі і калгасніцы нашага раёна з энтузіязмам працуюць над аднаўленнем разбуранай калгаснай гаспадаркі, разгортваюць падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

За паўтара месяцы па раёну адноўлена 649 разбураных і поўразбураных дамоў, пабудавана 62 новых дамы і 704 зямлянкі.

Ва ўсіх калгасах разгорнута работа па стварэнню насенна-страхавых фондаў. Толькі за 5 дзён, з 5 па 10 лютага, у насенныя фонды калгасаў сабрана 500 цэнтнераў зернавых. Пяршынства належыць калгасу імені Молатава, Зайкаўскага сельсовета. Ініцыятарамі стварэння насеннага фонда тут з'явіліся калгаснікі Нікалай і Фёдар Маскалёвы і калгасніца Зінаіда Зенчанка, якія першымі здалі па 20 пудоў зернавых у насенны фонд. Калгаснікі ў кароткі тэрмін пабудавалі добрыя зямлянкі для захоўвання насення.

Вядома, якую вялікую ролю ў паспяховым выкананні вясенне-палявых работ будзе адыгрываць конь. У раёне адкрыта ветлячэбніца, два ветзоаўчасткі і пры іх тры газакамеры. Добра працуе Рудняская газакамера, якая забяспечвае калгасную санітарную апрацоўку хворых коней.

Па-гаспадарску клапоцяцца аб коні ў калгасе імені Сталіна (старшыня т. Вараб'ёў). Коні стаяць у добрым памяшканні, забяспечаны кармамі, за імі наладжан добры догляд.

Вялікая ўвага звернута ў калгасах раёна на падрыхтоўку сельгасінвентара да веснавой сяўбы. Прыклад у гэтым паказваюць калгасы Руднянскага сельсовета. У трох сельгасарцелях гэтага сельсовета—імені Сталіна, імені Кірава і імені Варашылава—за кароткі тэрмін адноўлены кузні, у якіх утвараецца рамонт інвентару.

Аднак, гэта ўсё яшчэ толькі пачатак нашай работы. Задача заключаецца ў тым, каб поўнасцю аднавіць нашу разбураную гаспадарку, аднавіць і адбудаваць дамы для калгаснікаў, штодзённа клапаціцца аб аднаўленні жывёлагадоўлі ў калгасах, не пакладаючы рук рыхтавацца да веснавой сяўбы.

І. АФАНАСЬЕЎ,
загадчык Мехаўскага Райза.

### Больш сабраць і вывезці мясцовых угнаенняў

ЦК ВЛКСМ адобрыў пачын комсамольцаў і калгаснай моладзі нашай краіны, разгарнуўшых соцыялістычнае спаборніцтва за выкананне плана збора і вывазкі мясцовых угнаенняў. З 1 лютага да 1 сакавіка 1944 года праводзіцца Усесаюзны комсамольска-маладзёжны месячнік па збору мясцовых угнаенняў і вывазцы гною на палі.

Комсамольцы і моладзь вызваленых раёнаў нашай вобласці з энтузіязмам уключаюцца ва Усесаюзны месячнік.

У Лёзненскім раёне гэта пытанне абмеркавалі на нарадзе комсамольскага актыва і на бюро Райкома комсамола. Ва ўсіх калгасах праходзяць комсамольска-маладзёжныя сходы. Комсамольцы і калгасная моладзь дружна бяруцца за збор мясцовых угнаенняў. Комсамольцы і моладзь калгаса „Яўна Дзіва“ ўзялі на сябе абавязацельства сабраць кожнаму па цэнтнеру попелу. Гэтыя абавязацельствы яны з чэсцю выконваюць.

Актыўна ўключыліся ў работу па збору мясцовых угнаенняў комсамольцы і моладзь Гарадоцкага раёна (сакратар т. Раханаў). Комсамольцы калгаса імені Варашылава і калгаса „Металіст“ ужо сабралі каля 10 пудоў попелу. Пасля комсамольска-маладзёжнага сходу ў калгасах Пролетарскага сельсовета сабрана 6 пудоў попелу, па калгасу „Гігант“ сабрана 7 пудоў.

Па ініцыятыве комсамолак Еўгеніі Сапраненка, Антаніны Раманавай і другіх у калгасах Вышадскога сельсовета сабрана 3,5 цэнтнера попелу, вывезена на палі 290 цэнтнераў гною і загатоўлена 290 цэнтнераў торфу.

Вучні Пяцінікаўскай пачатковай школы на чале з настаўніцай комсамолкай Марыяй Маскалавай сабралі 10 пудоў попелу.

Да збору попелу прыступілі комсамольцы і моладзь Суражскага і Дубровенскага раёнаў.

Аднак, зробленае—толькі пачатак вялікай справы. Трэба, каб збор мясцовых угнаенняў і вывазка гною на палі вяліся на поўны ход. Чым больш калгас накопіць мясцовых угнаенняў і вывезе на палі гною, тым вышэйшы атрымае ўраджай, а Радзіма і Чырвоная Армія атрымаюць больш прадавольства.

Комсамольцы і моладзь павінны стаць ініцыятарамі гэтай вялікай справы.

В. РАДКЕВІЧ.

Адназны рэдактар А. КРУШЫНСКІ.